# ЛЕНИН И ТЕПЕРЬ ЖИВЕЕ ВСЕХ ЖИВЫХ, НАШЕ ЗНАНЬЕ, СИЛА И ОРУЖИЕ

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 17 (362) | Пятніца, 24 красавіка 1959 года | Цана 20 кап.



У. І. ЛЕНІН

## Новыя правілы прыёму ў ВНУ

Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР зацвердзіла правілы прыёму ў вочныя вышэйшыя навучальныя ўстановы СССР на 1959 год. У адпаведнасці з прынятым Законам «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР» у правілах прыёму на 1959 год указана, што ў ВНУ прымаюцца асобы, якія маюць станоўчыя характарыстыкі-рэкамендацыі для паступлення ў ВНУ ад партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый, кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў, праўленняў калгасаў. Школьнікі павінны прадстаўляць характарыстыкі-рэкамендацыі школ і іх грамадскіх арганізацый.

Ва універсітэты і іншыя навучальныя ўстановы па спецыяльнасці: журналістыка, правазнаўства, літаратурная работа, філасофія, палітычная эканомія будуць прымацца толькі асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш чым 2 гады. У педагагічныя, медыцынскія, стаматалагічныя, фармацэўтычныя інстытуты, а таксама па спецыяльнасці «міжнародныя адносіны» ў ВНУ будуць залічвацца пераважна асобы, якія маюць вопыт практычнай работы.

Без уступных экзаменаў па меры падачы заяў у ВНУ залічваюцца ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, якія маюць атэстат выдатніка сярэдняй школы, або ўзнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатымі ці сярэбранымі мядалямі «За выдатныя поспехі і прыкладныя паводзіны». Затым прымаюцца асобы, якія станоўча праявілі сябе на рабоце і маюць не менш чым 2 гады стажу практычнай работы ў прамысловасці і сельскагаспадарчай вытворчасці або у іншых галінах народнай гаспадаркі, культуры, аховы здароўя, дзяржаўнага кіравання, а таксама ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і дэмабілізаваныя з Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, атрымаўшыя найбольш высокія адзнакі на ўступных экзаменах. Прычым у першую чаргу з іх залічваюцца асобы, якія маюць стаж практычнай работы па выбранай у ВНУ спецыяльнасці.

У тых выпадках, калі колькасць пададзеных заяў ад удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і асоб са стажам практычнай работы не менш чым два гады, а таксама дэмабілізаваных з Савецкай Арміі і Флоту перавышае 80 працэнтаў плана прыёму па данай ВНУ або факультэту, дырэктары вышэйшых навучальных устаноў павінны выдзяляць на агульны конкурс не менш чым 20 працэнтаў месц ад плана прыёму. На месцы, што застануцца пасля залічэння асоб, указаных вышэй, будуць прымацца абітурыенты, атрымаўшыя найбольш высокія адзнакі на ўступных экзаменах з улікам прадстаўленых імі характарыстык-рэкамендацый для паступлення ў ВНУ.

У правілах прыёму ў ВНУ ўказваецца, што пры конкурсным адборы будзе ўлічвацца не толькі агульны вынік экзаменаў, але і ў першую чаргу адзнакі па прадметах, якія адпавядаюць профілю выбранай спецыяльнасці. Пры аднолькавых адзнаках па прафілёвых дысцыплінах і іншых аднолькавых умовах перавага даецца асобам, якія маюць найбольш высокія вынікі па астатніх прадметах уступных экзаменаў.

На спецыяльнасці: энергетычныя, машынабудаўнічыя, прыборабудаўнічыя прафілёвымі дысцыплінамі з'яўляюцца матэматыка (пісьмова і вусна), фізіка (вусна), непрафілёвымі—руская мова і літаратура і замежная мова. На спецыяльнасці: філалагічныя, лінгвістычныя прафілёвымі дысцыплінамі з'яўляюцца руская мова і літаратура (пісьмова і вусна), замежная мова, непрафілёвая—гісторыя СССР. На гістарычныя, філасофскія, гісторыка-архіўныя, юрыдычныя, бібліятэчныя і культурна-асветныя работы прафілёвымі з'яўляюцца руская мова і літаратура (пісьмова і вусна), гісторыя СССР (вусна), непрафілёвыя)—замежная мова.

У правілах прыёму 1959 г. уведзена палажэнне, згодна з якім пісьмовыя экзамены праводзяцца пад дэвізам і ацэньваюцца камісіяй у складзе не менш чым два экзаменатары. Як і ў мінулым навучальным годзе, у прыёмныя камісіі ВНУ будуць уваходзіць прадстаўнікі партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.

(ТАСС).

*И. ПЕХТЕРЕВ*

## Апрельским днём

*Пропахший почкою заволглой,*
*Дул ветер яростный с полей,*
*Пересыпал апрель за Волгой,*
*Как жемчуг, цепи журавлей.*
*В тот час Владимирской дорогой*
*На смерть колодники брели,*
*Взяв от родимого порога*
*Комок оттаявшей земли.*
*Они брели.... И стаей птичьей*
*Плыли за ними облака.*
*Ломая лед, полна величья,*
*Вздымалась русская река.*
*И, набухая гневом синим,*
*Стихая клокотала вся...*
*В тот вешний день в моей России*
*Великий Ленин родился.*

☆

Зараз ва універсітэце праходзяць навуковыя канферэнцыі студэнтаў, прысвечаныя рашэнням XXI з'езда. Шэраг цікавых дакладаў быў заслухан на пасяджэнні секцыі гістарычных навук. Многія з іх з'явіліся вынікам плённай навуковай работы студэнтаў і маюць пэўны тэарэтычны інтарэс. З асаблівай цікавасцю слухалі студэнты даклады Ф. Налівайкі, Р. Міронччыкавай, Э. Ліпецкага і іншых.

**НА ЗДЫМКУ:** з дакладам выступае студэнтка 4-га курса гістарычнага факультэта Р. Міронччыкава.

☆



# ІМЯ—ЗНАМЯ

— Если
    блокада
        нас не сморила,
если
    не сожрала война
        горяча,
то потому,
        что примером,
            мерилом
были слово
    и мысль
        Ильича,—

гэтыя радкі Маякоўскага гучаць глыбокай гордасцю за веліч ленінскіх спраў. А яна неперאўзыйдзена. Імя Леніна заўсёды непарыўна звязана з гісторыяй нашай барацьбы і нашых перамог. Заснаванне партыі, барацьба за чысціню марксісцкіх ідэй, перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі, першыя крокі маладой савецкай дзяржавы—усё гэта прасякнута кіпучай ленінскай энергіяй. Імя Ільіча — гэта знамя барацьбы за камунізм, за шчасце ўсяго чалавецтва, знамя рэвалюцыйнай бессмяротнасці і смелай творчай думкі.

22 красавіка народы нашай краіны, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначылі 89-ую гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна. Цяжка, немагчыма пераацаніць усё тое, што зрабіў Уладзімір Ільіч для нашай партыі, для народа, для міжнароднага рэвалюцыйнага руху. Выдатны тэарэтык марксізма, ён развіў далей вучэнне навуковага камунізма ў новых гістарычных умовах, ачысціў яго ад апартуністычных скажэнняў. Геній Леніна зрабіў марксізм магутнай зброяй пралетарыята ў барацьбе за ўстанаўленне свайго эканамічнага і палітычнага панавання. Гэта Ленін кіраваў рабочым класам Расіі ў яго барацьбе супраць самаўладства, гэта ён стварыў, выхаваў, ідэйна ўзброіў, закаліў у рэвалюцыйных бітвах нашу слаўную Камуністычную партыю—«розум, гонар і сумленне нашай эпохі». Пад кіраўніцтвам Леніна перамагла сацыялістычная рэвалюцыя, была створана першая ў свеце сацыялістычная дзяржава.

Пасля перамогі рэвалюцыі перад партыяй і народам паўсталі новыя гістарычныя задачы. Яны заключаліся ва ўмацаванні рабоча-сялянскай дзяржавы, у пераадоленні тэхнічна-эканамічнай адсталасці краіны, у забеспячэнні пабудовы сацыялізма. Ленін і партыя распрацавалі і далі нашаму народу велічную праграму пераўтварэння краіны на аснове сацыялістычнага будаўніцтва.

План прадугледжваў у найкарацейшы тэрмін стварыць магутную айчынную прамысловасць, электрыфікаваць усю народную гаспадарку, стварыць буйную механізаваную сельскую гаспадарку, няўхільна павышаць матэрыяльны і культурны ўзровень жыцця працоўных. У аснову ленінскага плана былі пакладзены творчыя сілы народа, узнятага Камуністычнай партыяй на велічную стваральную працу.

Прайшлі гады, і мы бачым як здзяйсняюцца ленінскія прадбачанні, як ленінскія ідэі, авалодаўшы масамі, сталі магутнай сілай. Наша краіна ператварылася ў магутную індустрыяльную дзяржаву. Многія народы Еўропы і Азіі знішчылі ў сябе капіталістычны лад і цвёрда сталі на шлях сацыялістычнага будаўніцтва. Сацыялізм ператварыўся ў міравую сістэму. Цяпер пад сцягам ленінізма крочаць 900 мільёнаў чалавек. Растуць сілы нацыянальна-вызваленчага руху. Гарыць зямля пад нагамі імперыялістаў у Афрыцы, Азіі, Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы. Незалежнасць атрымала Гана, перамаглі рэвалюцыі на Кубе, у Іраку, абудзіліся ад каланіяльнага сну Конга, Камерун, мужна змагаецца за сваю незалежнасць народ Алжыра.

XXI з'езд КПСС, верны запаветам Леніна, акрэсліў шляхі пабудовы камунізма ў нашай краіне. Так, мы будуем камунізм, і імя Леніна служыць нам сцягам, пад якім мы змагаемся за ажыццяўленне рашэнняў XXI з'езду. Вобраз Ільіча, правадыра і настаўніка усіх працоўных, вечна будзе натхняць нас на новыя перамогі, на новыя подзвігі. Вучэнне Леніна ўсемагутнае, знамя ленінізма бессмяротнае.

ПАГАВОРЫМ АБ ЭТЫЦЫ

# БУДУЧЫНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА СЁННЯ

Правілы сацыялістычнага супольнага жыцця патрабуюць, каб кожны чалавек у сваіх узаемаадносінах з акружаючымі праяўляў да іх павагу, чуласць, клапат аб іх выгадах, каб усе яго паводзіны былі пранізаны высокім пачуццём такту.

Культурныя нормы паводзін выпрацоўваліся на працягу стагоддзяў. Некаторыя правілы цяпер адкінуты, таму што не адпавядаюць новым сацыяльным умовам і сучаснаму ладу жыцця. Захаваліся толькі тыя, што выражаюць узаемную павагу, роўнасць, сяброўства і робяць супольнае жыццё людзей радасным і культурным.

Мы жывём у эпоху разгорнутага будаўніцтва камунізма. Заданні сямігодкі захапляюць сваёй грандыёзнасцю саміх савецкіх людзей, якія ўжо звыкліся з высокімі лічбамі здзейсненых пяцігодак. Аднак трэба памятаць і аб тым, што для пабудовы камунізма недастаткова аднаго стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы. Не менш важна і выхаванне ўсебакова развітага і падрыхтаванага чалавека будучага камуністычнага грамадства.

Гэта ў першую чаргу датычыцца нас, студэнтаў, як маладога пакалення, якому прыдзецца сваімі рукамі будаваць гэтае грамадства. Але якраз культуры ў многіх студэнтаў не хапае. Не варта пералічваць усе правілы паводзін, іх і так усе добра ведаюць. Проста хочацца спыніцца на некаторых недахопах нашага студэнцкага жыцця. Вельмі часта можна назіраць такую карціну: пры ўваходзе ў вучэбны корпус стаіць дзяўчына і чакае пакуль цэлы натоўп юнакоў выйдзе з корпуса. І рэдка каму прыдзе ў галаву прапусціць яе. Праўда, аднакурснікі яшчэ робяць нейкія спробы прытрымлівацца некаторых правіл паводзін, а што датычыць да незнаёмых, дык яны, відавочна, кіруюцца прынцыпам—усё абыйдзецца і так: мы іх не ведаем, і яны нас не ведаюць. Часта хлопец, вітаючыся з дзяўчынай, нават не лічыць патрэбным выцягнуць рукі з кішэні ці папяросу з зубоў.

І зразумела, культурны чалавек не кіне паперу на падлогу, разважаючы: «Прыбіральшчыца падыме, яна за гэта грошы атрымлівае». Асабліва абураючыя ўтрыманцкія адносіны да ўсяго на свеце. Усе вельмі добра ведаюць свае правы і вельмі часта забываюць аб сваіх абавязках.

Вельмі ярка ўсё гэта выяўляецца на вечарах.

Ідзе канцэрт мастацкай самадзейнасці, выступаюць свае ж сябры, для якіх цішыня ў зале проста неабходная—яны вельмі хвалююцца. Нажаль, сустракаюцца яшчэ некультурныя студэнты, якія ў час выканання праграмы шэпчуцца, скрыпяць крэсламі, перасмейваюцца, перашкаджаючы другім слухаць і глядзець.

На танцавальных вечарах маладыя людзі часта не думаюць, што запрашаць дзяўчыну на танец трэба невялікім паклонам, а не проста хапаючы за руку.

Многія хлопцы з'яўляюцца на вечар, папярэдне выпіўшы «дзеля смеласці». Што яны разумеюць пад гэтым словам? Можа тое, што ў такім стане будуць смялей запрашаць дзяўчыну на танец? Але ніводная паважаючая сябе дзяўчына з такім хлопцам танцаваць не пойдзе.

Часта вінаваты ў гэтым самі дзяўчаты. На іх кладзецца двайная адказнасць—за свае паводзіны і за паводзіны хлопцаў. Многія назіраюць, як адзін і той жа хлопец у прысутнасці розных дзяўчат трымаецца па-рознаму. І гэта натуральна. Возьмем такі прыклад. Ля акна размаўляюць хлопец і дзяўчына: яна ненатуральна гучна смяецца на ўвесь корпус, а ён стаіць разваліўшыся, абапіраючыся абодвума локцямі на падаконнік. І гэтага ўжо дастаткова, каб зразумець, што ён не паважае сваёй сяброўкі, а ў той няма дзявочай гордасці.

Але што тоіцца за словамі «культурны чалавек»? Хіба справа ў тым, што ты завучыш—хлеб трэба браць рукой, а не відэльцамі, пальчаткі трэба здымаць спачатку з правай рукі, а потым з левай, а надзяваць—наадварот, вітаючыся з жанчынай не падаваць руку першым і г. д. Справа, зразумела, не ў гэтым. Можна добра ведаць усе правілы паводзін, зрабіўшыся вытанчаным як паветраны гімнаст, але твая чалавечая сутнасць ад гэтага не зменіцца. Вышэйшым крытэрыем савецкай сацыялістычнай этыкі з'яўляецца барацьба за пабудову камунізма. Сапраўды культурны чалавек ніколі не стане адносіцца да людзей, да радзімы па-ўтрыманцку, у яго да ўсяго творчы падыход. Ёсць яшчэ сярод нашай моладзі людзі, якія фанабэрацца сваёй безыдэйнасцю, ухіляюцца ад удзелу ў грамадскай працы, лічачы, што ўсе выгоды жыцця павінны сыпацца на іх ні за што, ні пра што. Камунізм—гэта справа мільёнаў людзей працы, яго будуе рабочы за сваім станком, даярка на ферме, вучоны ў лабараторыі, педагог у школе. Кожны павінен свядома ўносіць свой уклад у агульную справу руху да камунізму. Такім укладам з'яўляецца найлепшае выкананне кожным даручанай яму справы.

Час адкінуць такі памылковы погляд, што камунізм мы будзем будаваць потым, калі скончым універсітэт. Для нас гэтая пабудова павінна выражацца ў вучобе, у выкананні грамадскіх даручэнняў, у паездках на работы ў калгас.

І. ГАЛЕЙ.

## Задумайцеся над гэтым

Ветлівасць, калі яна ідзе ад сэрца, ад шчырасці,—гэта звычайная норма паводзін у адносінах паміж савецкімі людзьмі. Калі ж чалавеку, асабліва даросламу, уласціва грубасць—гэта трэба разглядаць як рэцыдыў мінулага. Гэта кладзецца на яго, як шэры пыл на вопратцы, які хочацца змахнуць зараз жа!

Іменна такую грубасць праявілі студэнткі II курса фізфака Макарэвіч і Багданава, адмовіўшыся выканаць дзелавую просьбу выкладчыка—перасесці з задніх радоў на пярэднія, што было больш зручным для вядзення заняткаў.

Што ж, магчыма гэтыя таварышы, прымусіўшы выкладчыка нервавацца, атрымалі маральную перамогу, паказалі што ў іх больш моцная воля?

Ні тое, ні другое.

Проста яны паказалі сваю грубасць, тую грубасць з якой зараз змагаецца ўся наша моладзь.

Цікава, а што думаюць аб гэтым таварышы Макарэвіч Багданавай?

М. М. СЯМАШКА,
выкладчык кафедры замежных моў.

## ПРОСТАЯ І СЦІПЛАЯ

Другі год вучыцца ва універсітэце на юрыдычным факультэце сціплая непрыкметная дзяўчынка Лёдзя Корзун. І, як часта бывае ў такіх людзей, яна больш за іншых вызначаецца сярод сваіх аднакурснікаў добрасумленнымі адносінамі да грамадскіх спраў, вучобы.

Праўда, не ўсе могуць атрымліваць заўсёды выдатныя адзнакі, чацвёркі ж таксама нялёгка даюцца. І ўсё ж мінулыя тры экзаменацыйныя сесіі Лёдзя Корзун здавала толькі на добра і выдатна.

Любіць Лёдзя і спорт. У мінулым годзе яна атрымала трэці разрад па веласіпедным спорце, а сёлета працягвае заняткі ў веласекцыі і падумвае над тым, як бы дасягнуць другога разраду. Што ж, трэніроўкі на шашы пакажуць, ці далёка яна ад сваёй мэты.

У гэтым навучальным годзе дзяўчына вырашыла авалодаць майстэрствам ваджэння аўтамабіля. Цяпер яна, як і іншыя гурткоўцы, акрамя тэарэтычных ведаў, атрымлівае практычныя навыкі кіравання машынай.

Многія студэнты юрыдычнага факультэта шэфствуюць над рабочымі Мінскага аўтамабільнага завода, якія вучацца завочна ў розных вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Лёдзя Корзун таксама дапамагае рабочаму аўтазавода А. Комліку лепш вывучаць нямецкую мову. Комлік займаецца завочна ў Беларускім палітэхнічным інстытуце імя Сталіна.

Удзельнічае Лёдзя ў хоры факультэта. Любіць паглядзець кіно, спектакль, наведвае лекцыі-канцэрты музычнага лекторыя. Ёй усё цікава.

Лёдзя жыве ў інтэрнаце юрыдычнага факультэта, у 37 пакоі. Няхай ён не першы і лепшы ў інтэрнаце ў спаборніцтве за чысціню, аднак чысціні, што пануе тут, могуць пазайздросціць жыхары многіх іншых пакояў. У гэтым вялікая частка яе працы.

— Ну, навошта пра мяне пісаць,—збянтэжана гаварыла дзяўчына, калі даведалася аб мэце нашага наведвання,—я ж нічога такога незвычайнага не раблю.

Але і гэтыя звычайныя, на першы погляд, справы самым лепшым чынам характарызуюць Леакадзію Корзун.

Я. ЛЯХАЎ.

НА КОНКУРС



ДЫПЛОМНІЦА.
Фотаэцюд Г. Праваловіча.

## АКТЫВІСТ І ДАСЛЕДЧЫК

Пасля паседжання ўноў выбранага камсамольскага факультэцкага бюро стала вядома, што сакратаром абраны Генадзь Браніцкі. Па дарозе ў інтэрнат ён адчуў нейкае хваляванне. Нямала новых спраў лягло на яго плечы. Зноў і зноў вяртаўся ён у думках да жыцця факультэта, імкнуўся ўнікнуць ва ўсё, ва ўсім разабрацца.

... Прыехаў ён у Мінск з атэстатам сталасці, распісаным серабранымі літарамі, з цвёрдым жаданнем паступіць на хімічны факультэт. З хіміяй ён блізка пазнаёміўся і палюбіў яе яшчэ ў школьным гуртку. Яму цікава было пазнаваць новае і аб пераўтварэннях рэчываў, і аб цудоўных якасцях, якія ў іх узнікаюць у выніку той ці іншай рэакцыі, і аб магутнай сіле ведаў хімікаў, здольных унікаць у жыццё нябачных часціц.

І вось Браніцкі студэнт I курса. Нярэдка можна было бачыць яго ў чытальнай зале. Настойлівая праца дае багаты плён—першая, а затым другая экзаменацыйная сесія здадзены на «выдатна». Летам Гена працаваў на ўборцы цаліннага ўраджаю. Здаралася, што пасля работы ён прыгадваў універсітэт і прыходзіў да вывады, што трэба пачаць займацца ў навуковым гуртку.

Пачаліся заняткі. Цяпер ужо Браніцкага можна было бачыць у лабараторыі неарганічнай хіміі. Ён заняўся навукова-даследчай работай пад кіраўніцтвам кандыдата хімічных навук В. В. Свірыдава. Вадзім Васільевіч аказаўся чулым, спагадлівым і карэктна-патрабавальным кіраўніком.

Летам навукова-даследчая работа Браніцкага была паслана на агляд гарадскіх студэнцкіх работ і атрымала другую катэгорыю.

І вось Браніцкага абралі сакратаром факультэцкага камсамольскага бюро. Амаль кожны дзень яго можна бачыць ва універсітэце. Пытанні самадзейнасці, паспяховасці, паседжанні, заняткі...

І калі Браніцкага ўжо многія выкраслілі з радоў маладых даследчыкаў, да яго падышоў Вадзім Васільевіч.

—Ёсць адна вельмі цікавая тэма, мне здаецца, яна вас зацікавіць.

І расказаў аб тым, што многа яшчэ няяснага ў тлумачэнні з'яў, якія ўзнікаюць пры расціранні парашкападобных рэчываў, у змяненні каталітычных уласцівасцей гэтых парашкоў.

Здавалася, не было ніякай магчымасці займацца навукова-даследчай работай, але Гена ўспомніў заняткі ў лабараторыі, успомніў, як ён любіў корпацца ў літаратуры.

Безумоўна, тэма яму спадабалася, а калі так, дык тады лягчэй і працаваць. Не ў першы раз думаў аб сваім раскладзе дня і ўсё больш мінут знаходзіў для любімай справы. Не, адно не павінна перашкодзіць другому!

Вясной у Харкаўскім універсітэце праходзіла навуковая студэнцкая канферэнцыя. Тут былі масквічы, ленінградцы, малдаване, украінцы. Сярод іх быў і Браніцкі. Яго даклад аб з'явах, якія ўзнікаюць пры расціранні парашкападобных рэчываў, выклікаў інтарэс шырокай аўдыторыі.

У мінулым годзе Генадзь зноў пабываў на цаліне. За добрую работу на ўборцы ўраджаю на цалінных землях важаку хімікаў уручылі грамату гарадскога камітэта камсамола.

Камсамольцы хімічнага факультэта ў які ўжо раз аказалі давер'е Браніцкаму, абраўшы яго сакратаром камсамольскага факультэцкага бюро.

... І зноў Гена бывае не толькі на сходах, пасяджэннях, але падоўгу заседжваецца і ў «сваёй» знаёмай лабараторыі. Колькі цікавага чакае яго там і тут.

В. БАЗЫЛЬЧЫК,
студэнт IV курса хімічнага факультэта.

# Літаратурная старонка

*М. ЖУК*

## З ўспамінаў

Абгарэлыя,
Абвугленыя хаты,
На папялішчах
Выбіўся быльнёг.
Крыкі сірат,
Плач дзяцей і матак
Ля крыжоў
Раз'езджаных дарог.
Апусцела
Спаленая вёска,
У паветры—
Гаркаваты дым.
І слязьмі
Надбітая бярозка
Гоіць боль,
Цвікастыя сляды.
Абгарэлы топаль,
Апусціўшы лапы, —
Паглядзеў—
І не пазнаў ніяк:
І чарэшань
Белыя накрапы,
І за хатай
Ссушаны вішняк.
Жабы квачуць
У снарадных ямах,
Песні сэрца
Пахаваў скрыпач.
І майструе
Чорнымі рукамі
За дарогай
Вісельні палач.
А са школы
Праз танго і вальсы
Далятталі высвісты
І крык.
Над дзявярыма ж
Старастравы пальцы
Прыбівалі
Невядомы крыж.
Шэры попел
Пад сябе забраў
прыгожасць,
Не глядзіць у вокны
рань.
Родны край!
Ты стоптаны,
зняможан,
Залячыў
Дзесяткі цяжкіх ран.

*У. КАРЫЗНА*

## Сіні месяц

То сонца дзень усмешкай распагодзіць,
Жаўрук аж заліваецца—звініць,
То, як мядзведзь пасля зімы ў бярлозе,
Варочаецца гром у вышыні.

Рака ў высокіх берагах гуляе,
Як сом хвастом, пялёхае ўвесь дзень.

Бярозы свае вочкі раскрываюць,
Каб на вясну з узгорка паглядзець.

На небе ні хмурыначкі. Бярозкі
Вясна зялёнай фарбай абліла.
І хутка з першай кветкаю за вёскай
Ад шчасця пацалуецца пчала.

*М. СТРАКОВ*

## Только тебе...

От тебя
Не требую я много:
Каплю ласки, нежности чуток...
Отчего же сердце бьёт тревогу?
И сомнений вяжется клубок.
Вижу взгляд
задумчивый и грустный,
Ты живёшь любя и нелюбя...
Может быть угасло твоё чувство,
Или я обманывал себя.
На сердце осел тяжелый
сгусток,
Кажется, что рвется дружбы нить..
Может я,
навязываюсь с чувствами,
Если только так, то извини...

*У. КАРЫЗНА*

## СІГУЛДА

Сігулда—месца чароўнае...
Ды слых жа ідзе нездарма,
Што ў свеце кутка ёй роўнага
Па прыгажосці няма.
І самаю шпаркаю пешшу
За дзень не абыйдзеш яе,
Сябе тут ніяк не нацешыш
Зялёным багаццем яе,
За день, як не пі, не нап'ешся
Мядовага паху яе!..
Тут кожны ручай табе можа
Легенду падаць сваю як!
І так ён цябе заварожыць,
Што з месца не сыйдзеш ніяк...
Ад замкаў—каменныя горы
Ляжаць у красе сівізны.
Здаецца, вось-вось загавораць
Яны пра цікавыя сны...
А к вечару ў спеве птушыным
Хацеў бы яшчэ аднаго:
Каб глянуць на цень ад рабіны,
Што недзе ля дому майго.

*Міхась ШУШКЕВІЧ*

## Прывет табе, вясна...

*Злучылася з маёй рукой*
*Твая рука гарачая.*
*Каханне наша ў ростані*
*Ні кроплі не растрачана.*
*Прывет табе, вясна мая.*
*Ты чыстая, як раніца.*
*І вочы твае ясныя*
*Растаннем не туманяцца.*
*Пяе са мною цэлы свет,*
*А вішні мне ўсміхаюцца.*
*І белымі пялёсткамі*
*Са мной сады вітаюцца.*
*І белымі пялёсткамі*
*Нам шлях удаль азначаны.*
*Каханне наша ў ростані*
*Ні кроплі не растрачана.*

# ВЕРШЫ В. КУНЕВІЧА

☆ ☆

## ИШИМ

Снимаем рубахи и майки—
Бросаемся с кручи в Ишим.
Кричат над затоками чайки,
Щетиной стоят камыши...

Не раз суховеи степные
Ишим выпивали до дна,
И снова дожди грозовые
Его наполняли сполна.

Никем чернозем был непахан
Вокруг ни двора, ни кола,
Лишь горькая песня казаха
Над рыжею степью плыла...

Где смерчи вели хороводы,
И норы сверлили сурки,
Глядятся в ишимские воды
Целинных земель городки.

Звенят комсомольские песни,
Казахское слышно: якши?
И жизни на свете чудесней
Не знал поседевший Ишим.

## Целинные колосья

Седовласый ковыль устилал степь когда-то,
А сегодня пшеница волнуется морем.
Каждый, колос крепыш, загорелый, усатый,
Как сорвёшь, так в руках горсть
отборнейших зёрен.
Возросли они там, где ни липы, ни вербы;
Где слышны без конца тракторов отголосья:
Будто были они в обрамлении герба,
Золотой целины, золотые колосья.

## ВЕСНА НА ГРАНИЦЕ

*В лесу стояла тишина.*
*Молчали в чащах птицы.*
*Шагал тропою старшина —*
*Он проверял границу.*
*И не заметил он как вдруг,*
*Весна, пройдя овражком,*
*Озеленила лес и луг*
*Под цвет его фуражки.*

# Была весна...

**РАССКАЗ-ШУТКА**

⊙

Весна наступала. Звонкими ручейками истекал раненный теплом снег. Казалось, что над планетой несётся какая-то чудесная мелодия, и все раскрывается навстречу ей, оживает, улыбается. Но все это не шло ни в какое сравнение с теми чувствами, которые переполняли меня. И причиной этого была не столько весна, сколько однокурсница Верочка. Да и весне еще приходилось бороться с последними яростными нападками зимы. Небо, ясное, синее-синее вдруг набрасывало на себя ватное одеяло облаков, и на не повинную ни в чем землю валил мокрый крупный снег; а мне казалось, что небо сердится, теряя свой престиж, потому что верочкины глаза были куда синее. И, может быть, писать было бы не о чем, если бы мой самый близкий друг Юрка Голосов не чувствовал тоже самое. Сначала это очень подействовало и на меня, и на него. Мы ревновали, сердились, на лекциях садились в разные углы аудитории и бросали оттуда пламенно-влюбленные взгляды на нее и не предвещающие ничего хорошего друг на друга. Но потом, убедившись, что никто из нас не уступит, опять стали неразлучны.

Так и получилось, что мы повсюду были втроем. Втроем шли из общежития на лекции, втроем возвращались, втроем ходили в кино... Конечно, я считал, что у меня больше шансов, чем у Юрки, хотя, наверное, у него было на этот счет свое мнение.

Весна давно уже отвоевала у зимы последние позиции. Приближалась сессия. Все наши девушки и ребята после лекций целые вечера просиживали в библиотеках и учебных кабинетах, только я ни за что не мог взяться. Со страниц учебников на меня смотрели синие верочкины глаза, слова сливались в одни темные сплошные линии, а линии принимали очертания верочкиных бровей; я откладывал книгу и уходил.

Часами бродил по веселым, зеленеющим аллеям парков, по шумным проспектам. Я даже начал писать стихи, в которых бесконечно рифмовались «кровь», «вновь», «бровь» с «любовь». Юрка пророчил мне, что я обязательно завалю сессию; он сам похудел, осунулся и все свободное время просиживал в библиотеке. Верочка готовилась к экзаменам с подругами, и мы теперь редко собирались вместе. Но как-то выбрались на последний сеанс в кино. На экране назревал острый конфликт. Положительный герой остался один, а отрицательный ушел с его любимой девушкой. Положительный скрипел зубами, судорожно сжимал кулаки. Его глаза яростно метали молнии, и не известно, что бы случилось, если бы не обычная в таких случаях спасительная гитара. Он взял ее в руки, тяжело вздохнул, и две прозрачные капли повисли на дрожащих ресницах. И в тот момент, когда переборы гитары наполнили зал, я почувствовал, как верочкина рука тихо опустилась на мою. Юрка сидел подавшись вперед с приоткрытым ртом, как будто пытался поймать им каждое слово песни. А верочкина рука оставалась лежать на моей до тех пор, пока на экране все не пришло к счастливой развязке. Юрка, по-моему, ничего не заметил. Мне же, когда мы вышли из кино, хотелось петь, прыгать, сделать что-нибудь необыкновенное, потрясающее. Теперь я уже ни в чем не сомневался и жил в радостном ожидании чего-то необыкновенного хорошего. С моего лица улыбка не сходила даже во сне. Юрка, конечно, замечал все это, и я часто ловил на себе его удивленные и немного встревоженные взгляды.

Но вот наступили праздничные дни. Май пришел к нам солнечный, теплый. Распустились первые нежные листочки, радостно порхали неугомонные птицы.

У нас был очень интересный вечер. Я тоже выступил в концерте с акробатическим номером. До этого я выступал только на соревнованиях, и когда вышел на сцену и посмотрел в зал—совсем растерялся. Мелодия уже успела повториться несколько раз, а я все еще не мог ни сдвинуться с места, ни убежать. Из зала слышались насмешливые реплики. Попробовали бы сами! И вдруг я услышал знакомый неповторимый голос:

— Дима, смелее!

И сразу я ощутил такой бурный прилив силы и смелости, что с места крутанул несколько сальто подряд, чуть не свалившись со сцены. В бешеном темпе я проделывал головокружительные броски, фляки, стойки... И когда, наконец, под бурную овацию я убежал со сцены, сердце мое готово было выпрыгнуть из груди.

А потом мы с Верочкой кружились в плавном вальсе. Юрка подпирал стенку в углу и смотрел на на нас грустными-грустными глазами. «Вот хорошо, что он не умеет танцевать»,—думал я, сильнее сжимая маленькую ручку. Вальс кончился. Я осторожно взял Верочку под руку и начал добросовестно пробираться через веселую толпу в угол к Юрке.

— Ой, Дима, тут очень жарко, пойдем на улицу.

Она схватила меня за руку, и мы выбежали в скверик напротив нашего корпуса. Здесь было тихо и прохладно, в тенистую аллею доносились приглушенные звуки музыки. И я решился сказать ей обо всем. Слова у меня были приготовлены давно, но теперь они моментально вылетели из головы, и я растерялся...

— Вера, я... Веришь, я:..—но большего я из себя выдавить не смог. Какой-то горький комок подступил к горлу, и я задыхался от волнения.

—Дима, не надо, я сама все скажу,—она тихонько дотронулась до моей руки, и я замер от счастливого ожидания.

— Знаешь, я, кажется, люблю, нет, не кажется, я очень очень люблю Юру. Не сердись на меня...

В первую минуту ее слова не дошли до моего сознания, и когда я, наконец, понял их смысл, мне показалось... я почувствовал, как у меня внутри что-то оборвалось и устремилось куда-то вниз, а глаза пытаются выскочить из своих строго установленных орбит...

Все это случилось давно, когда мы были еще на первом курсе. В ту злопамятную сессию я получил два «хвоста». И первым, кто помог мне освободиться от них, был Юрка. И вот опять наступает весна. Я уже нисколько не завидую Юрке, я рад, что у него все хорошо. Мы с ним опять самые задушевные друзья, и только по какому-то молчаливому сговору, когда остаемся вдвоем, никогда не упоминаем о Верочке.

**С. ПОЛЯКОВ.**

НА КОНКУРС

# Дом, у якім мы жывем

**Нарыс**

— Зноў любы інтэрнат да позняй ночы
Струменіцца святло з тваіх акон,—

гэтыя словы Рыгора Барадуліна прыгадаліся Яўгену Шарамецьеву, калі ён выйшаў з камітэта камсамола на шырокі універсітэцкі двор і ўбачыў перад сабой агні інтэрната.

Быў цёплы вясновы вечар, а ў паветры—разліты водар першых лісткоў таполяў, якія, здавалася, лопаліся пад няўтрымным націскам маладых жыццёвых сокаў зямлі. З галін на асфальт асыпаліся кроплі вады. Навокал так хораша, што хочацца хадзіць да поўначы, дыхаць і дыхаць цёплым духмяным паветрам. Пасля зімы інтэрнат, здаецца, упершыню расчыніў вокны ўсіх чатырох паверхаў і радуецца-не-нарадуецца першаму дажджу, першаму грому і гэтакай ранняй вясне.

Светла і хораша на душы ў Яўгена. Побач сябры, але юнаку хочацца пабыць аднаму, успомніць даўняе, мінулае і сёлетняе... Як там яго сябры североморцы? Можа зноў яго карабель імкне наперад, рассякаючы груддзю хвалі, а вуха песціць мяккае шархаценне вады за бартамі...

Можа зноў трывога... А можа мічман, суровы і грозны на першы погляд чалавек, у апошні раз абыходзіць кубрыкі перад сном. Не, ніколі не забудзе Яўген мічмана-запарожца, свайго першага настаўніка і сябра. Гэта ён навучыў яго дысцыпліне, парадку і падцягнутасці. Гэта пад яго уплывам Яўген стаў адным з лепшых воінаў падраздзялення, уступіў у рады Камуністычнай партыі... Бяжыць час. Ці даўно Яўген быў маракам, насіў шырокі матроскі клёш, галандку, бесказырку...

А цяпер ён зусім цывільны. Нават не верыцца іншы раз. У снах ён яшчэ жыве ўсё тым жа жыццём, баявым, напружаным...

Яўген на ўсе грудзі ўдыхнуў цёплае паветра, прыбавіў кроку і рашуў прайсціся па прыгожай, апранаючай свой зялёны гарнітур сталіцы...

У вачах зноў устала пасяджэнне камітэта камсамола і прафкома, успомніліся спрэчкі, што адбыліся на пасяджэнні.

Горача сёння прыйшлося членам камітэта і прафкома. Але як не спрачаліся фізматаўцы, як не даказвалі, камісія ўсё-такі прысудзіла першую прэмію інтэрнату філфака... За лепшы парадак і санітарны стан, за лепшае ўвядзенне самаабслугоўвання...

А зараз радасна было на сэрцы яшчэ і ад адчування таго, што вось, можа, у гэтай справе ёсць доля і яго старання, яго намаганняў.

Яўген прыпомніў, як усё гэта пачалося...

...Невялічкі ленпакой інтэрната не ўмяшчаў усіх жадаючых прысутнічаць на сходзе, прыйшлося шырока расчыніць дзверы, ды папрасіць прамоўцаў выказвацца гучней.

— Нічога ў нас не выйдзе з самаабслугоўваннем, — гаварылі старыя члены студсавета,—хіба ты прымусіш, напрыклад, пяцікурснікаў мыць калідоры?

— Асабліва хлопцаў...

— Вызваліць трэба пяцікурснікаў...

— Ці не занадта?—пачулася рэпліка,—у пяцікурснікаў часу вольнага, можа, больш, чым у каго...

— Чытайце,—не вытрымаў Шарамецьеў,—мы ж самі прымалі гэтую пастанову на камсамольскім сходзе. І тыя ж самыя пяцікурснікі галасавалі. Мо' думалі, што пад шумок так усё і пройдзе. Дзіўна неяк атрымоўваецца..

— Што ты хочаш сказаць?— перабіў яго хтосьці з пяцікурснікаў.—Просім карацей.

Яўген успыхнуў, загарачыўся. Але ён стрымаў сябе і цвёрда кінуў:

—Добра. Магу і карацей. За парадак трэба брацца па-сапраўднаму. Трэба пераходзіць на самаабслугоўванне ўсім без выключэння...

— А сэканомленыя грошы—у камсамольскую скарбонку,—дадала студэнтка IV курса беларускага аддзялення Зіна Макарэвіч каторы год нязменны член студсавета.

...На тым памятным сходзе быў вылучаны новы студсавет, які аднадушна абраў Яўгена Шарамецьева старшынёю. Нямала цяжкасцей прыйшлося пераадолець студкому і новаму старшыні. Рознае бывала. Прыходзілася некаторых і на студсавет выклікаць, і ў насценгазеце крытыкаваць. Асабліва тых, хто баяўся дакрануцца да анучы, пашкодзіць лак на пазногцях, забрудзіць рукі, хто цураўся працоўных мазалёў.

Памочнікі ў Яўгена падабраліся добрыя: з 4-га курса Ліда Гапонава, Зіна Макарэвіч, Наташа Палумян, з І-га—Святлана Бокач, Васіль Сілік і др. Былі паміж імі размеркаваны абавязкі, назначаны адказныя. Нястомныя студкомаўцы амаль штотыдзень правяралі санітарны стан пакояў, строга сачылі за выкананнем графікаў дзяжурства, за чыстатою на калідорах і кухнях.

У чым заключалася самаабслугоўванне? Тут, калі трэба, і пробку перагарэўшую самому наладзіць і берагчы рэчы хатняга ўжытку, і добра (каб нідзе не было ні пылінкі) падлогу вымыць, працерці вокны і г. д. Нескладаныя абавязкі і не многа часу яны патрабуюць, але і за гэта трэба было змагацца, каб стала яно штодзённай звычкай, каб ніколі не парушаліся парадак і рэжым, заведзены ў інтэрнаце. Тады ж студсавет вызначыў 16 прэмій і дыпломаў за выдатны стан пакояў. Цяжка было выявіць лепшы пакой. Шукалі не толькі ў дзяўчат, але і ў хлопцаў, хаця даўно вядома, што дзяўчаты гаспадарыць куды лепш хлопцаў. Узяць хаця б 49-ы і 16-ы пакоі, дзе жывуць дзяўчаты. Цяжка сказаць, дзе лепей.

У 16 пакоі ўжо ва ўсім бачан прыход вясны: першыя вясновыя кветкі на падаконніках, рэпрадукцыі з карцін вядомых мастакоў «Незнаёмая», «Сасновы лес», «Дубовы гай», гіпсавыя аляняты, «Іван-царэвіч»... А ў 49 пакоі, дзе старастай Соня Касцюшка, у вазончыках жывыя кветкі, і вышывання таго не менш, і гардзіны заўсёды, як снег, бялюткія...

І тыя, і другія прытрымліваюцца раз заведзенага рэжыму: устаюць у 8 гадзін, гаспадарнічаюць на кухні, затым ідуць ва аўдыторыі, у бібліятэкі. Часу для вучобы ў іх аказваецца заўсёды дастаткова...

Агульнауніверсітэцкая камісія засталася задаволенай парадкам у інтэрнаце. Інтэрнат заняў першае месца і атрымаў прэмію ў 3 тысячы рублёў. Яўген ужо зараз думае, што на гэтыя грошы трэба купіць новую радыёлу, адрамантаваць тэлевізары, ну і затым пакоі 49, 39, 21, 26, 59 і многа другіх былі ўзнагароджаны падарункамі і дыпломамі.

Бралася за поўнач, а агні інтэрната гараць усё ярчэй, гараць, пераміргваюцца з вачыма вежавых кранаў, што стаяць тут, зусім недалёка. Там, ідзе будоўля новага галоўнага корпуса універсітэта.

Яўген Шарамецьеў рашуча закрочыў да інтэрната.

За Мінскам усё яшчэ недзе грымеў гром. З адчыненага акна трэцяга паверху ляцелі гукі радыёлы, на мокрым асфальце каля дому кружыліся пары. Жэня прайшоў міма танцуючых у дом, ведаў, што хутка замоўкне музыка, заціхнуць песні. А яшчэ праз якіх-небудзь некалькі тыдняў пачнуцца экзамены—напружаная пара для студэнтаў. І Яўген не хацеў ударыць тварам у гразь перад таварышамі, хацелася з поспехам закончыць першы курс.

А на вуліцы пакуль што грымелі песні, разносіліся над горадам, узляталі ў блакіт. Інтэрнат, наш дом, як вялікі сябра, радасна свяціўся ўсмешкамі агнёў, быццам весяліўся разам з усімі..

Дом, у якім мы жывем. Дом, у якім жылі вы, нашы папярэднікі. З ім звязваюцца самыя лепшыя ўспаміны, светлыя мары, здзейснёныя надзеі. Ці няпраўда?!

Праязджаючы ці праходзячы міма яго, у каго з вас не заб'ецца сэрца! Так і здаецца, што ён цяпер, як некалі, калі выпраўляў вас у жыццё, і як цяпер перад экзаменам, кожнаму свайму выхаванцу скажа студэнцкай прыказкай: «Ні пуха, ні пяра...».

Вясёлы, гасцінны студэнцкі дом—інтэрнат. Ты штогод выпускаеш са сваіх дзярэй нашых таварышоў, і ў цябе прыходзіць новае папаўненне. Без нас ты не можаш, а мы без цябе. Няхай жа свецяць твае агні нам усюды, стой і не старэй ніколі дом № 7 па Бабруйскай вуліцы, дом, у якім мы жывем!

**Р. ЗАЛЕСКІ,**
**У. ПАЎЛАЎ.**

## Фізкультура і спорт

### Закончылася першынства па валейболу

Закончыўся розыгрыш першынства універсітэта па валейболу. За ганаровае званне чэмпіёна змагаліся 9 жаночых і 7 мужчынскіх каманд. Тры жаночыя каманды — матфак-1, матфак-2 і гістфак—прыйшлі да фініша з адным паражэннем і з роўнай колькасцю ачкоў. Першае месца прысуджана камандзе матфака—II. Каманда за час першынства прайграла толькі дзве партыі, шэсць сустрэч выйграла з лікам 2:0. Другое месца заваявалі валейбалісты гістфака, трэцяе—каманда матфака-І.

Зусім слаба выступалі жаночыя каманды філфака. Валейбалісты першай каманды не змаглі выйграць ні адной сустрэчы і занялі апошняе месца. Не намнога лепш гуляла і другая каманда.

Настойліва змагаліся за першае месца мужчынскія каманды. Толькі ў дадатковай сустрэчы лідэраў—каманд хімфака і фізфака-І — выявіўся пераможца. Фізікі выйгралі важную сустрэчу і сталі чэмпіёнамі на 1959 год. На другім месцы валейбалісты хімфака, на трэцім—гістфака.



Балельшчыкаў на гэтых спаборніцтвах было нямнога, але «хварэлі» яны горача, як і ўсе балельшчыкі на свеце.

### Добры пачатак

Лепшыя бегуны універсітэта прынялі ўдзел у кросе, прысвечаным адкрыццю летняга спартыўнага сезона. Крос праводзіўся ў раёне парка Перамогі. Надвор'е якна не спрыяла спаборніцтвам. Ішоў дождж, траса была цяжкай. Нягледзячы на гэта, студэнтка геафака Т. Сахацкая дабілася выдатнага поспеху. Кросавую дыстанцыю ў 1000 м яна прабегла за 3 мін 8 сек, абагнаўшы майстра спорту Р. Ачкіну. Добры пачатак! Маладая спартсменка гістфака А. Лаўруковіч хутчэй за ўсіх прабегла 500 м. Яе вынік 1 мін. 27 сек.

### ПОСПЕХІ І НЯЎДАЧЫ

У табліцу вынікаў круглагадавой спартакіяды універсітэта занесены ачкі, якія набралі факультэцкія каманды па плаванню. Першынства праводзілася ў плаванні на 100 м вольным стылем, брасам, батэрфляем, на спіне, па эстафетах. Па гэтаму віду спорта першае месца заваявалі плаўцы геафака. Каманда фізфака выйграла другое месца, юрысты—трэцяе.

А філолагі зноў засталіся апошнімі, усё больш і больш губляючы магчымасць заняць па выніках спартакіяды месца лепш мінулагодняга. Паказальна, што залік даў толькі адзін плавец каманды філфака—усяго 5 ачок.

*Г. ФАМІН.*

### ЛЁГКААТЛЕТЫ НА ДРУГІМ МЕСЦЫ

22 красавіка быў дадзен старт традыцыйнай лёгкаатлетычнай эстафеты, прысвечанай 89-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. У эстафеце прынялі ўдзел спартсмены 13 вышэйшых устаноў Мінска.

На этапах разгарэлася напружаная барацьба. Палову дыстанцыі лідзіравалі нашы бегуны. І толькі на самым вялікім этапе прадстаўніку Інстытута фізкультуры В. Сідараву ўдалося адарвацца ад стуэднта геафака А. Лабунскага. Разрыў ліквідаваць не ўдалося. Так каманды і прыйшлі да фінішу.

Прыз рэктарата БДУ імя У. І. Леніна, як і ў мінулым годзе, заваявала каманда ІФК. Яе час 13 мін. 52 сек. Каманда універсітэта заняла другое месца з часам 14 мін. 5 сек. На трэцім месцы палітэхнічны інстытут.

Каманды, занаўшыя прызавыя месцы, узнагароджаны граматамі рэктарата.

**Ю. НІКАЛАЕЎ.**

**Папраўка**

У № 16 нашай газеты ў заметцы «Сход назначае камандзіраў дружыны» допушчана памылка. Апошнія радкі першага абзаца трэба чытаць: «... выступіў сакратар Ленінскага РК КПБ» і далей, як у тэксце.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 3143 Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна Тыраж 2000 экз. Зак. 539.